# КСЕНІЯ ЗАРЭЦКАЯ



## Мяне там чакаюць

Апавяданне

Зарэцкая Ксенія нарадзілася 10 лютага 2002 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Першая публікацыя адбылася ў 13 гадоў у часопісе «Волшебный». З літаратурнай прозай друкавалася ў раённай газеце «Кобрынскі веснік» і альманаху «аБДУмана». Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы публікаваліся на старонках часопісаў «Маладосць», «На экранах» і «Бярозка», газет «Культура», «ЛіМ», «Переходный возраст». Працуе рэдактарам. Жыве ў Мінску.

### I

Туве не адразу зразумела, што ўсё скончана. Думкі аб выратаванні яшчэ круціліся ў галаве, яна спадзявалася выбрацца жывой, вярнуцца дадому, зваліцца на ложак прама ў вопратцы, а назаўтра ўсім распавядаць, натхнёна размахваючы рукамі, што з ёй здарылася. І сябры б смяяліся, таму што Туве ўмее рассмяшыць, дзівіліся б яе ўдачлівасці і здольнасці вырывацца з самых жудасных сітуацый, можа, не вельмі цэлай, але жывой, і яна была б гераіняй вечара, а хутчэй за ўсё, і некалькіх дзён. Яна б атрымала тыдзень адпачынку, спала б па дванаццаць гадзін, аб'елася б пірагоў з капустай і дачытала б нарэшце любоўны раман, назву якога так і не запомніла, але на вокладцы была дзяўчына ў неверагодна пышнай, падобнай на пірожнае з вітрын Новага Горада, сукенцы.

Удача адвярнулася ад Туве гэтай раніцай, уцякла, бліскаючы пяткамі, пакінула сам-насам з рэальнасцю. Удача кінула Туве, і ёй не заставалася нічога іншага, акрамя як ірвануць у руіны. Яна віхляла па абломках будынкаў, спадзеючыся адарвацца. Вокны, што па нейкай прычыне яшчэ не былі разбітыя, адлюстроўвалі маленькую фігурку ў ярка-аранжавай куртцы (гэта ўсё куртка! Яна прынесла няшчасце! Ну чаму, чаму Туве пашкадавала грошай на новую, звычайнага чорнага колеру, куды больш прыдатную для падпольшчыкаў, чым гэта мандарынавае непаразуменне?).

Туве бегла наўздагад, зрэдку пераскокваючы праз нейкія падазроныя кучы смецця. Навабранцаў прымушалі запамінаць карту з усімі вядомымі пасткамі, але яна як ганаровы член арганізацыі змагла пазбегнуць экзамена. Не дурніца ж яна, каб совацца ў Стары Горад у адзіночку, без падрыхтоўкі, без плана?

# МІХАЛ БАРАНОЎСКІ



## Жыццё навырост

Вершы

Бараноўскі Міхал нарадзіўся 9 снежня 1984 года ў Мінску. Скончыў БДПУ імя Максіма Танка па спецыяльнасці «гісторыя і замежная мова». Аўтар паэтычных зборнікаў «Volumen.1» і «Volumen.2», а таксама шматлікіх навуковых і публіцыстычных публікацый, прысвечаных беларускай літаратуры, укладальнік кнігі «ЖЗЛБ. Максім Багдановіч».

✦ ✦ ✦

з берага вясны
на бераг восені
па хвалях тваіх плыву

даланёй
ваду без памяці п'ю

у жаданні забыцца
у ластаўку перакулілася сэрца

чакае дажджу
рака

✦ ✦ ✦

...el tuétano intraductible de nuestra lengua...
*Miguel de Unamuno*

гайна бесядзь няміга нёман
обаль арэса цна
прыпяць шчара вілія свіслач
ясельда днепр дзвіна
убарць проня дрыса славечна
сож сцвіга дзісна
лань ушача зэльвянка ула
ісլач беразіна
праз стагоддзі ляціць да нас
рэха забытых слоў
голас ціхне бяжыць вада
будучыні наўздагон

# КСЕНІЯ ДЗІВЕНКА



## Складнікі мяне

Эсэ

Дзівенка Ксенія нарадзілася 14 студзеня 2003 года ў аграгарадку Людзяневічы. Студэнтка 4 курса факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Літаратурны дэбют у «Маладосці».

### Маці

Апошнім часам мне часта ўспамінаецца дзяцінства. І чым старэйшым я станаўлюся, тым часцей успыхваюць трапяткія агеньчыкі памяці дзесьці далёка ў глыбіні маёй свядомасці. Цяпер я стараюся як мага часцей прыязджаць дадому, каб убачыць родных і сяброў, набрацца сіл і проста адпачыць душой і целам. І кожны мой прыезд напаўняецца цёплымі ўрыўкамі мінулага наўпрост з дзяцінства.

Вось я іду каля поля, дзе калісьці стаяла невялікая драўляная царква...

«Прачынайся, нам пара»,— чую голас маці і ледзь расплюшчваю вочы.

Сцены пакоя залітыя прыемным жоўтым адценнем ранішняга сонца. І я не разумею, чаму мне трэба ўставаць у такую рань. Пакуль я павольна апранаюся, мама нешта робіць на кухні і просіць мяне паспяшацца. Яна дае мне трохі свянцонай вады, і мы выходзім на вуліцу.

Сонца толькі падымаецца, а мы чамусьці ідзём у поле, а не на вуліцу. Я не памятаю, пра што мы гаварылі і ці гаварылі наогул, але я выразна запомніла, як трава была мне па пояс, а кроплі расы непрыемна адчуваліся на целе, якое яшчэ адыходзіла ад сну. Сонца хацела паглядзець, як я старанна сваімі маленькімі ножкамі бегла за мамай, таму з кожнай хвілінай яно было ўсё вышэй.

Высока ў небе бачныя былі купалы, і я зразумела, што мы праз поле скарацілі дарогу да царквы. Далей памятаю толькі акуратны дворык перад прыходам і саму царкву: невялікі, але акуратны будынак, прыемныя на слых спевы малітвы і святло з акна на алтары. Дадому я вярнулася з нейкім незразумелым для сябе адчуваннем і яснай галавой.

У дзяцінстве мама часта прывучала мяне да ранішніх служб, але з часам

гэтая традыцыя па многіх прычынах пачала знікаць. У мяне не засталося іншых успамінаў пра наведванне царквы, але менавіта той дзень я памятаю як учора, бо тады кожная хвіліна здавалася чароўнай.

Гэтую царкву даўно знеслі. На яе месцы стаіць крыж у рознакаляровых стужках, але я лёгка магу ўваскрэсіць мінулае і ўявіць той будынак, які пакінуў глыбокі след у маёй памяці. Ён стаў для мяне сімвалам спакою і гармоніі. Але рэальнасць перамагла...

Прайшлі гады, я бывала шмат у якіх гарадах і краінах, таму не выпускала магчымасці дакрануцца да святыняў дзесьці яшчэ, але нічога не грэе душу так, як тая старая царква ў дзяцінстве.

«Прачынайся, нам пара»,— чую голас маці і ледзь расплюшчваю вочы. Але пакой больш не заліты сонечным святлом. А мне пара на маршрутку...

## Сяброўства

Як лёгка было заводзіць знаёмства ў дзяцінстве. Памятаю, як хацелася гуляць са сваімі аднагодкамі, калі заставалася летам у бабулі з дзядулем, але нікога паблізу не ведала. Бабуля неяк сказала: «У суседнім доме, у такім жа пад'ездзе і ў такой жа кватэры, жыве дзяўчынка тваіх гадоў. Яе завуць Тоня».

Ужо праз пяць хвілін я стаяла перад гэтай кватэрай і нясмела стукала ў дзверы. Адчыніла жанчына гадоў сарака. Даведаўшыся, чаму я прыйшла, яна паклікала дачку. Праз парог на мяне глядзела худая дзяўчынка прыкладна майго росту з цёмнымі прыгожымі вачыма і доўгімі, амаль чорнымі валасамі.

Я і падумаць тады не магла, гледзячы на яе, што потым мы будзем такія неразлучныя. Усё лета мы дзяліліся сакрэтамі ў цені вінаградніку, прыдумлялі свае гульні і атрымлівалі асалоду ад бесклапотнага часу. Нават у дрэннае надвор'е мы не разыходзіліся па дамах, а шукалі дах, пад якім маглі б разам перачакаць дождж і навальніцу. Мы выдатна бавілі час разам. І нават калі так здаралася, што сварыліся, хтосьці з нас пакідаў пасланне мелам на асфальце з двума простымі словамі «прабач мне». І не было такога, каб гэта рабіла ўвесь час толькі я ці Тоня. Паміж намі заўсёды быў нейкі баланс, які не трэба было выбудоўваць. Ён проста быў сам па сабе і падтрымліваў наша моцнае сяброўства. Тоня незаўважна стала важным чалавекам у маім жыцці.

Бабуля жыве адносна недалёка ад мяне. Таму з Тоняй мы дзялілі не толькі летнія дні, а яшчэ і восеньскія, зімовыя і вясновыя. І заўсёды было так, што ніхто не разыходзіцца па хатах, пакуль сонца не сядзе за гарызонт. І назіраць за заходам лепш за ўсё, зноў жа, каля бабулінага дома, бо за ім знаходзіцца вялікае поле, за якое кожны вечар хавалася свяціла.

І традыцыя гэтая не парушалася, пакуль я не паступіла ў гімназію...

З гэтай пары сустрэчы сталі радзейшымі, сакрэтаў менш, а гэты самы рытуал — праводзіць сонца — вычарпаў сябе. Так здараецца кожны раз, калі змяняецца абстаноўка. І гэта нармальна. Першы час балюча было адчуваць паміж намі з Тоняй прорву, якой раней не было. Але з кожнай сустрэчай яна расла, а прынццэ яе стала непазбежным.

І ў далейшым жыццё раскідала нас па розных гарадах і пры выпадковай сустрэчы мы маглі пагаварыць, але не больш за пяць хвілін. Пасля такога асадак заставаўся са мной да канца дня. І кожны раз я думала: як людзі, якіх так шмат звязвала, могуць стаць амаль чужымі адзін аднаму?

Яшчэ праз некаторы час мы сталі незнаёмкамі.

Так бывае, калі людзі сталеюць і кожны выбірае сваю дарогу, бо бесклапотнае дзяцінства застаецца недзе там, далёка ззаду. Мы выраслі.

І вось я стаю ля парога яе кватэры. Знаёмыя пахі прымушаюць мяне вярнуцца ў мінулае. Мне хочацца пагаварыць з ёй пра ўсё на свеце, як калісьці даўно. Так шмат сакрэтаў назапасілася за амаль дзесяць гадоў... Дзверы, у якія мне так часта даводзілася стукаць, сталі такімі маленькімі. Дакладней, гэта я вырасла. Мая рука



# ВІКТАР ЯРАЦ



## Амулет залаты на бярозе

Вершы

Ярац Віктар нарадзіўся 23 кастрычніка 1948 года ў пасёлку Красны Мост Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Гомельскі педагагічны ўніверсітэт, аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры. Кандыдат філалагічных навук. Працаваў загадчыкам сельгасаддзела рагачоўскай раённай газеты «Камунар», на Гомельскай студыі тэлебачання, выкладчыкам Гомельскага педагагічнага ўніверсітэта (з 1978 г.— дацэнт). Аўтар зборнікаў вершаў «Уваходзіны», «Добрыца», «Дняпроўскі бакен», «Зямныя эцюды». Перакладчык твораў балгарскіх, літоўскіх, рускіх, украінскіх паэтаў на беларускую мову.

### Зялёная вышыня

Па высечках пайсці, па расцяробах
да некранутых у глушы ялін,
што сто гадоў у злубянелых робах
трывогі долу шлюць і ў неба сінь.

У ранах на ствалах з карой бугрыстай,
у шрамах ад маланак шаравых
змаглі яліны выжыць, роўна выстаяць.
Якой пілой апошні
іх падпілуе міг?

### Дзень асенні

Вачамі і рукой пагладжу твой партрэт
на мармуры халодным днём асеннім.
Маршчынкі самай тонкай чую след —
ён не загладжаны ні сонцам і ні ценямі.

І голас, параднёны з глыбінёй,
мне адазвецца пад бярозы веццем,
што днём і ноччу сон вартуе твой,
які на свеце
вечным сном завецца.

І мармура настылая пліта
цяплее і са мною дзеліць, мама,
твой ціхі выдых, што аднойчы немата
схавала ў дол з лістком завялым і апалым.

Але і з той бязмоўнасці ідзе
дыханне, прабіваючы маўчанне
і ў гэты, хмарамі забінтаваны дзень,—
і ў гэты дзень
твайго са мной вітання...

✦ ✦ ✦

Вечар кастрычніцкі позні.
Лісток — амулет залаты на бярозе.
Выток мой.
Тут і калючкі рапешніка ніколькі не колкія.

# УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

## «Адпрацаваць і адваяваць сваё»

### З запісных кніжак

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» працягваецца выданне чарговых тамоў Збору твораў Уладзіміра Караткевіча. Выдадзена 20 тамоў, здадзены ў набор 21-ы.

У том 22-і, які рыхтуецца да выдання ў наступным годзе, увойдуць дзённікавыя запісы пісьменніка. Невялікая частка іх друкавалася ў 1989 годзе ў часопісе «Полымя» пад назвай «У дарозе і дома: з запісных кніжак».

Запісныя кніжкі захоўваюцца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, фонд 11, вопіс 2, адзінкі захоўвання 479—496.

Усе запісы друкуюцца ўпершыню.

Прапануем чытачам «Маладосці» тры тэкставыя блокі з запісных кніжак.

Першы з іх — запісы розных гадоў, часта без датавання. Менавіта сюды трапілі вершы Уладзіміра Караткевіча, якія не ўвайшлі ў першыя два тамы Збору твораў, бо на той час не былі навукова апрацаваны запісныя кніжкі. Паэтычныя творы ў асноўным напісаны ў 1950-я гады яшчэ маладым паэтам, таму сустракаюцца разнастайныя недахопы, пакінутыя без змен. Дададзім, што ў Збор твораў будуць уключаныя і рускамоўныя запісы пісьменніка, а яны ва ўніверсітэцкі (1949—1954 гг.) і «школьны», калі Уладзімір Караткевіч працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры (1954—1958 гг.), перыяды вяліся пераважна на рускай мове.

Другі тэкставы блок — дзённікавыя запісы, зробленыя ў чэрвені 1970 года падчас турыстычнай паездкі па Чорным моры на цеплаходзе «Победа» (Адэса—Севастопаль — Ялта — Сочы — Сухумі — Навarасійск — Ялта — Адэса).

Трэці тэкставы блок — дзённікавыя запісы, зробленыя ў ліпені 1971 года падчас паездкі ў Бешанковіцкі, Чашніцкі і Лепельскі раёны Віцебскай вобласці з экспедыцыяй «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Такіх паездак Уладзімір Караткевіч ажыццявіў некалькі, у прыватнасці, у ліпені 1970 года ў Пінскі і Столінскі раёны Брэсцкай вобласці (дзённікавыя запісы з гэтай паездкі апублікаваны ў 1989 годзе). Паездкі адбываліся і дзякуючы таму, што ў названай акадэмічнай установе працавала жонка пісьменніка Валянціна Браніславаўна, кандыдат гістарычных навук, якая была разам у экспедыцыях.

Запісныя кніжкі, з аднаго боку, дакумент эпохі з канкрэтнымі фактамі (падзеі, прозвішчы, пасады, найменні розных аб'ектаў і г. д.), а з другога — набліжаныя да мемуарнай прозы самастойныя творы Уладзіміра Караткевіча. Пішучы нібыта для сябе, творца ўяўляе далейшы лёс «свайго дзіцяці», разумее, што падобныя запісы ўсё адно знаходзяць шлях да чытача, і стараецца быць шчырым ва ўсім. Варта ўлічваць і тое, што У. Караткевіч планаваў змясціць упарадкаваныя дзённікавыя запісы ў асобную кнігу «Гады вандраванняў».

---

*1950—1954 гг.*

---

Байран мой, геній мой, як мне дзякаваць табе за тую вялікую непамерную моц, што ўліў ты ў сэрца маё, у душу маю. Што табе ўсе напады, што табе мярзота ворагаў тваіх. Жадаў бы я ведаць ангель-

скую мову, але і па-руску ты размаўляеш са мной і да смерці маёй будзеш...[1]



Не ўсе ж такія, як твайго бацькі дзеці.

**Дубовае лісце.** Хто сказаў, што дубовы ліст «адарваўся ад галіны радзімай»[2]. Не. Даўно ўжо адышла пара пышнага квету ўсяго, ужо і зіма на дварэ, а дубовы ліст трымаецца і застанецца на галіне да вясны, як бы не сек яго сівер і навальніца. Ён дажывае да вясны, а потым адпадзе, бо ён не патрэбны. Але ён — сапраўдны.

### Радзіме

Я адну толькі маю надзею,
Калі гасне купальскі цвет —
Ў вочы мне заглянула фея,
Калі я нарадзіўся на свет.
А каму яна ў вочы загляне,
Той змагацца пойдзе са злом,
Той і ў ноч прадбачае ранак,
Той ніколі не будзе рабом.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ты, як я, радзілась ў лістападзе.
Кветкі долі тваёй адцвілі.
Дзе твая залацістая радасць?
Дзе ты, воля любай зямлі?

Але я не губляю надзею,
Ў то, што ты дабярэшся да зор,
Бо глядзелася некалі фея
Ў вочы ясных тваіх вазёр.



* * *

Пачакай! Яшчэ ранак не скора.
Гнуцца кветкі пад ветрамі ніца.
З-за заставы зялёнага бора
Пахне мяккай лясной расяніцай.

* * *

Хаткі ў лесе. Радзіма мая.
Неспачываючы спеў салаўя.
Родны мой край. Залатое каханне,
Зноў да цябе павяртаюся я.

Сосны чырвоныя ў стромкім бары,
Дуб мой зялёны, мой сябра стары,
Вы у дзяцінстве мяне калыхалі,
Вы пеставалі мяне да пары.

11 июля [1954 г.]

* * *

Немудрашчыя травы,
Рапяхі каля пыльнай дарогі,
Сталі мы як сябры,
Што не бачыў
Я з далёкіх дзяцінства гадоў.

[1] Выява аркуша запісной кніжкі з партрэтам Байрана змешчана на с. 89 у т. 18 Збору твораў Уладзіміра Караткевіча.
[2] Спасылка на радкі народнага паэта БССР Аркадзя Куляшова (1914—1978) з паэмы «Сцяг брыгады»: «Як ад роднай галінкі дубовы лісток адарваны, // Родны Мінск я пакінуў, нямецкай бамбёжкаю гнаны».



# КІРЫЛ ХАЛЕЦКІ

## У месцы, дзе няма мастацтва, пра яго мараць

*Рэжысёр — прафесія, якая прыраўноўвае чалавека амаль да бажаства. На памяць адразу прыходзяць такія велічыні, як Віктар Тураў, Андрэй Таркоўскі або Квенцін Таранціна. Ці ёсць у сучаснай Беларусі рэжысёры? І што яны здымаюць? Пытанне не тое каб дыскусійнае, хутчэй — надзённае. І адказ на яго — перад вашымі вачыма.*

*Кірылу Халецкаму крыху за дваццаць, а ён ужо паездзіў па сусветных фестывалях, прэзентуючы свае кароткаметражкі, і ў наступным годзе плануе ўзрадаваць галоднага да ўсяго новага гледача камедыяй «Кіношнікі». Наша размова атрымалася насычанай, напоўненай як рэжысёрскімі, так і журналісцкімі інсайтамі: пра тое, як гэта — вучыцца ў творчай ВНУ, наколькі важна адчуваць падтрымку блізкіх і як не страціць сябе ў чарадзе кампрамісаў. Запасайцеся папкорнам!*

### Жыў-быў добры хлопец

***— Апошнім часам ты даволі часта даеш інтэрв'ю, і я заўважыла, што звычайна цябе прадстаўляюць як маладога таленту, які, нягледзячы на ўзрост, стаў зоркай беларускага кінематографа. Гэтыя прыстаўкі «малады», «нягледзячы на» — не абражаюць?***

— Я ўжо прывык. Гэта такі вобраз «добрага хлопца», які сеў на мяне даволі арганічна. Ды і СМІ на маім прыкладзе паказваюць маладому пакаленню: «Яму ўсяго дваццаць два, а ён змог зняць фільм. І ў вас атрымаецца!» Напэўна, гэта правільна, але я ў любым выпадку імкнуся хутчэй перайсці да сутнасці: да маіх праектаў і творчых амбіцый.

***— Тады і я не буду цягнуць. У чацвёртым класе бацька аддаў цябе ў кінашколу — не самы распаўсюджаны дзіцячы гурток. Чаму менавіта туды?***

— Я заўсёды бачыў сябе ў творчасці, хацеў забаўляць людзей. І сям'я мяне ў гэтым падтрымлівала. Першая адукацыя таты — кінамеханік, ён вельмі

цікавіўся закуліссем працэсу стварэння фільмаў. Мама ж усё дзяцінства здымала мяне на камеру — захавалася больш за 70 гадзін відэаматэрыялаў. Памятаю, у 2011 годзе мы з татам патрапілі на здымкі серыяла «Адліга». Тады ў маіх вачах загарэўся агонь, я захацеў пранікнуць у глыбіню таямнічага кіношнага свету. А паколькі быў дзіцем, самым простым шляхам аказалася акцёрства. Па радыё ішоў набор у кінашколу, тата гэта пачуў, і я пачаў займацца. Спярша ўяўляў сябе на чырвонай дарожцы пад успышкамі сотняў фотакамер. Пасталеўшы, зразумеў, што мне больш падабаецца знаходзіцца па іншы бок аб'ектыва. Аднак цяпер, ужо як рэжысёр, магу дазволіць сабе маленькія камеа.

— ***Значыць, нашы чытачы маглі бачыць цябе ў нейкіх стужках яшчэ дзіцём?..***

— У асноўным я ў рэкламе мільгаў. Была асабліва папулярная — ад аднаго аператара сотавай сувязі. Роля ў мяне на секунду: здзімаў пыл з нейкай тумбачкі. Я быў упэўнены, што прачнуся зоркай. Аднак поспех не спяшаўся да мяне, таму пайшоў на хітрасць: калі быў у людных месцах, у аўтобусе, напрыклад, ціхенька што-небудзь адкуль-небудзь здзімаў. А раптам пазнаюць?

— ***Не пазналі?***

— Ані разу. Але і я зразумеў, што гэта не галоўнае. Цяпер для мяне куды важней якасць працы, а не колькасць людзей, якія будуць ведаць, як я выглядаю. Лепш ацаніце мае карціны.

## Вера, надзея і першы крок

— ***Доўга ты наведваў кінашколу?***

— З чацвёртага па сёмы клас. Нават сертыфікат атрымаў. Паволі працягваў адпраўляць партфоліа на кастынгі, але агента не меў, таму роляў не меў таксама. Перыядычна запрашалі на камерцыйныя і творчыя здымкі, аднак гэтага было значна менш, чым у папярэднія гады. Сваю мару прабрацца ў кіношны свет я ўсё ж не адпусціў. І ў дзявятым класе зняў першы кароткаметражны фільм. Мы з аднакласнікамі былі акцёрамі, зладзілі маскі-шоу, смяяліся, устаўлялі гэгі і шчыра весяліліся. Праца вельмі спадабалася тым, хто яе ўбачыў, ды і я магу прызнаць, што з тым вопытам, які тады меў, выйшла няддрэнна. Наогул, не лічу патрэбным зневажаць сябе мінулага. На той момант гэта было ўсё, што я мог даць. Зараз да таго відэа адчуваю толькі лёгкае пачуццё настальгіі. Але ў любым выпадку стала зразумела: трэба паступаць на рэжысёра.

— ***Бацькі не былі супраць такога выбару? Звычайна ж хочуць для сваіх дзяцей больш «сур'ёзнай» і «прэстыжнай» прафесіі.***

— Не былі. У дзяцінстве маці вадзіла мяне і ў басейн, і на каратэ, і на дзюдо, і нават на маляванне. Бацькі не абмяжоўвалі ў свабодзе самавыяўлення. Бачылі мае задаткі і ніколі не ставілі выразных рамак, не планавалі за мяне лёс. У дзявятым класе я наогул пачаў у КВЗ гуляць, таксама нуль пытанняў і пярэчанняў: вучобе гэта не перашкаджала, затое для агульнага развіцця — супертрэніроўка. Многія гульцы ў КВЗ становяцца сцэнарыстамі камедыйных праектаў на рускамоўных тэлеканалах і інтэрнэт-платформах. Тата сам запісаў мяне на падрыхтоўчыя курсы ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Звычайна на іх займаюцца год — перад паступленнем,— але я правучыўся два: пачаў у дзясятым класе, каб зразумець, ці маё гэта, і, калі што, мець фору ў часе, паспрабаваць нешта іншае. Большасць падлеткаў у нас вельмі рэзка развітваюцца з дзяцінствам. Вось адзінаццаць гадоў школы, калі ты бесклапотны, нічога не вырашаеш і плывеш з урока на ўрок па плыні, а потым — абухом па галаве — дарослае жыццё і адказнасць за зроблены выбар. Многія не спраўляюцца. Ідуць туды, куды хапае сярэдняга бала, марнуюць час упустую, не працуюць па спецыяльнасці. Я так не хацеў. Мне важна было ў першую чаргу апраўдаць уласныя чаканні.